УДК 316.733:008

# Культуралізацыя грамадзянства як вынік пераасэнсавання мультыкультуралізму

**Крывалап А. Д.**
*Установа адукацыі “Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт”, Наваполацк*

*У артыкуле разглядаецца канцэпцыя культуралізацыі грамадзянства як выкліку для існавання практыкі сацыяльнага станаўлення ў кантэксце разумення культурнай ідэнтычнасці, аналізуюцца падыходы да разумення практыкі сацыяльнага станаўлення (П. Штомпка, С. Хол). Важная роля надаецца пераасэнсаванню праблемы ідэнтычнасці як выніку працэсу сацыяльнага станаўлення ва ўмовах мультыкультурных таварыстваў, а таксама таго, якія выклікі для існуючых практык канструявання ідэнтычнасці нясе канцэпцыя культуралізацыі грамадзянства (Я. Дайвендак). Зробленыя ў артыкуле назіранні і высновы дазваляюць аўтару сфармуляваць ідэю аб тым, што выкарыстанне канцэпту “культуралізацыя грамадзянства” дазваляе па-новаму зірнуць на працэсы дыялогу культур у сучасных умовах. У выпадку перамогі праекта культуралізацыі грамадзянства супольнасці сутыкнуцца з дамінаваннем аднаго кананічнага варыянту напаўнення культурнымі сэнсамі паняцця “грамадзянства”, што можа прывесці ў выніку да зацыклівання і паўтарэння.*

***Ключавыя словы:*** *культуралізацыя грамадзянства, сацыяльнае станаўленне, культурныя даследаванні, рэпрэзентацыя, глабалізацыя.*

# Culturalization of Citizenship as a Results of Rethinking Multiculturalism

**Krivolap A. D.**
Educational Establishment “Polatsk State University”, Navapolatsk

*The topic of the article was to consider the concept of citizenship culturalization as a challenge to the existence of the practice of social formation in the context of understanding cultural identity. The text examines the approaches to understanding the practice of social maturation (P. Sztompka, S. Hall). The purpose of this text is to rethink the problem of identity as a result of the process of social maturation in the conditions of multicultural societies, as well as of the fact that the challenges for the existing practices of identity construction are the concept of the culturalization of citizenship (J. Duyvendak). The observations and conclusions made in the article allow the author to formulate the idea that the use of the concept of the culturalization of citizenship makes it possible to take a fresh look at the processes of cultural dialogue in current conditions. In the case of the victory of the project of the culturalization of citizenship, the society will face the dominance of one canonical variant of filling the concept of citizenship with cultural meanings, and as a result, culture inevitably fixates on self-reproduction and repetition.*

***Key words:*** *culturalization of citizenship, social maturation, cultural identity, cultural studies, globalization.*